*Новыя старты*

# ДАЛУЧЫЦЦА ДА ЭСТАФЕТЫ ЧЫСЦІНІ

**У краіне пачаўся Нацыянальны чэмпіянат «Кубак чысціні Беларусі». Валанцёрскія камандныя спаборніцтвы пройдуць ва ўсіх абласцях па 24 верасня і аб'яднаюць каля 500 экадобраахвотнікаў.**

Старт Нацыянальнаму чэмпіянату «Кубак чысціні Беларусі» далі экаваланцёры руху «Добрае Сэрца» Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ у сталічным парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Першае экамерапрыемства чэмпіянату аб'яднала каманды мінскіх устаноў вышэйшай адукацыі — 25 каманд, 75 чалавек.

Пасля рэгістрацыі ўдзельнікаў быў інструктаж па тэхніцы бяспекі і правілах чэмпіянату. Далей — размінка перад спаборніцтвамі. Мерапрыемства стартавала з традыцыйнай «Народнай зарадкі» і дадатковых актыўнасцяў «Экаметкасць», «Артэфакты».

Як праходзіць мерапрыемства? Галоўная тэма — раздзельны збор смецця. Узброіўшыся наборам удзельніка чэмпіянату (у яго ўваходзяць бэйдж, пакеты для збору розных відаў смецця — шкла, металу, пластыку, паперы, пальчаткі), каманды экадобраахвотнікаў зоймуцца зборам смецця на хуткасць. За кожны напоўнены ім пакет каманда атрымае ўстаноўленую колькасць балаў. Пасля пераводу балаў з дапамогай спецыяльнай праграмы ў кілаграмы адбудзецца вызначэнне чэмпіёнаў.

У час падвядзення вынікаў спаборніцтваў пераможцы атрымаюць прызы. Абсалютна ўсіх удзельнікаў мерапрыемства чакае прыемны бонус — пікнік на свежым паветры.



Фота з сайта БРСМ.

Эстафету чэмпіянату ў Мінску ўчора прынялі валанцёры Гродна, сёння — Пінска і Магілёва, заўтра — Полацка, 23 верасня — Гомеля і Мінскага раёна Мінскай вобласці.

Арганізатары — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі — упэўнены, што падобныя праекты прыўносяць у валанцёрскі рух БРСМ новую форму эфектыўнага камандаўтварэння і карыснага вольнага часу. Яны накіраваны не толькі на экалагічную асвету юнакоў і дзяўчат, але і праз захапляльную гульню па добраўпарадкаванні прыродных тэрыторый — на згуртаванне маладзёжных калектываў.

Дарэчы, у перыяд па 24 верасня больш за 200 аналагічных Нацыянальнаму чэмпіянату «Кубак чысціні Беларусі» мерапрыемстваў адбудуцца яшчэ ў дзевяці краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў: Расіі, Азербайджане, Арменіі, Казахстане, Кыргызстане, Таджыкістане, Туркменістане і Узбекістане. Усе яны будуць садзейнічаць падрыхтоўцы добраахвотнікаў-эколагаў да ўдзелу ў Міжнародным турніры «Еўразійскі кубак чысціні», правядзенне якога запланавана вясной 2024 года, які быў аб'яўлены ў краінах СНД Годам валанцёрскага руху.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Камертон настрою*

# АСАБІСТЫ «ПРЭС-КОД» — ДЛЯ КОЖНАГА АЎТАРА

**Больш за 300 заявак паступіла ў аргкамітэт для ўдзелу ў другім сезоне рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код».**

У новым сезоне арганізатары творчага спаборніцтва прапанавалі шэраг намінацый, у якіх маладыя журналісты і блогеры маглі б атрымаць першае прызнанне сваёй творчасці: сярод друкаваных СМІ — «Найлепшыя аўтарскія матэрыялы» (рэпартаж, спецыяльны праект патрыятычнай тэматыкі), «Найлепшая карыкатура па найбольш вострай сацыяльнай тэматыцы», «Найлепшы фотарэпартаж». Сярод электронных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў — «Найлепшы відэасюжэт аб памятных мясцінах Беларусі, вядомых людзях, знамянальнай падзеі», «Найлепшы відэаблог», «Найлепшая апаратарская работа», «Найлепшы праект у новых медыя».

Аргкамітэт конкурсу падвёў вынікі першага тура праекта. Была атрымана 341 заяўка. 20 верасня ў горадзе над Бугам на базе гандлёва-забаўляльнага комплексу «Брэст» адбылася першая абарона конкурсных матэрыялаў 28 удзельнікаў з Брэсцкай вобласці.

25 верасня эстафету папярэдняй абароны работ прыме Мінск. Сёлета больш за ўсё заявак паступіла менавіта ад сталічных аўтараў — 87. Таму прынята рашэнне разгледзець работы мінчан у два праслухоўванні: 25 верасня — на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі і 28 верасня — на базе інавацыйнага цэнтра холдынга «Гарызонт». Самы насычаны дзень конкурсу — 27 верасня. Сустрэчы з маладымі журналістамі адбудуцца ў Віцебску, Гродне і Магілёве. 29 верасня ўдзельнікаў конкурсу ад Гомельскай вобласці чакаюць у Гомелі, 30 верасня ад Мінскай вобласці — у Рэспубліканскім доме моладзі ў сталіцы. У склад рэгіянальнага журы ўвайшлі прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі, органаў выканаўчай улады, грамадскіх аб'яднанняў і папулярныя блогеры. Фінальны рэспубліканскі адбор запланаваны на лістапад.

Другі сезон рэспубліканскага конкурсу маладых журналістаў «Прэс-код» стартаваў 15 ліпеня на палях рэспубліканскага медыяфоруму БРСМ PROdigital. Праект рэалізоўваецца Міністэрствам інфармацыі і ЦК БРСМ пры падтрымцы Мінадукацыі.

Конкурс змяніў свой фармат, і з гэтага года абавязковай умовай з'яўляецца асабістая абарона свайго аўтарскага матэрыялу кожным намінантам. Прычым двойчы. Першая — на ўзроўні рэгіёна. Другая — на ўзроўні рэспублікі, ужо пасля перамогі ў рэгіянальным адборы. Гэта зроблена для больш аб'ектыўнай ацэнкі творчасці хлопцаў і дзяўчат і магчымых рэкамендацый экспертаў асабіста кожнаму аўтару.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



*Ідэі маладых*

# МАДЭЛЬЕРЫ І ДЫЗАЙНЕРЫ, ВАШ ВЫХАД!

**Конкурс маладых дызайнераў адзення «Сузор'е» ўпершыню пройдзе ў БДУ. Да ўдзелу ў ім запрашаюцца студэнты профільных спецыяльнасцяў беларускіх ВНУ і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама маладыя дызайнеры і мадэльеры.**

Спаборніцтва ўключае тры намінацыі. У катэгорыі «Fashion-эскіз» неабходна падрыхтаваць эскізы калекцый мужчынскага, жаночага або дзіцячага адзення. Іх трэба прадставіць у электронным выглядзе ў якасці шматфігурнай кампазіцыі фармату А3, якая складаецца з пяці кампанентаў.

Намінацыя «Дызайнер адзення» прадугледжвае складанне электроннага мудборда з кароткім апісаннем канцэпцыі гатовай калекцыі і яе фатаграфіямі. Калекцыя павінна ўключаць сем камплектаў адзення, а таксама мець дэвіз і музычнае суправаджэнне.

Для «Конкурсу адной мадэлі» трэба будзе скласці і адлюстраваць у фатаграфіях вобраз, які складаецца з касцюма, візажу, прычоскі, па жаданні аксесуараў і абутку. Дапускаецца сумесная работа дызайнера, візажыста і цырульніка.

Для ўдзелу неабходна даслаць заяўку на электронны адрас kafedramoda@bsu.by. Прыём работ у першай намінацыі працягнецца да 1 кастрычніка, у астатніх — да 18 кастрычніка. У лісце з паметкай «Конкурс» трэба пазначыць імя і прозвішча, намінацыю, назву работы, дату выканання і копію студэнцкага білета або дыплома аб заканчэнні ўстановы адукацыі, а таксама спасылку на фатаграфіі эскізаў і калекцый адзення.

У сярэдзіне снежня журы вызначаць фіналістаў конкурсу. Паказ іх калекцый адбудзецца на гала-паказе, дзе назавуць імёны пераможцаў у кожнай з намінацый. Работы будуць ацэньвацца па змесце канцэпцыі калекцыі і візуальным афармленні. Таксама ў сацыяльных сетках конкурсу адбудзецца адкрытае галасаванне на «Прыз сімпатый гледачоў».

У склад журы ўвойдуць спецыялісты беларускай fashion-індустрыі, выкладчыкі кафедры дызайну моды факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ, вядучыя дызайнеры, кіраўнікі кампаній-вытворцаў адзення, мастацтвазнаўцы.

Арганізатарам мерапрыемства выступае факультэт сацыякультурных камунікацый БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У ліку найлепшых*

# МОЛАДЗЬ МАГІСТРАЛІ СУПРАЦЬ КАРУПЦЫІ

**На Беларускай чыгунцы падведзены вынікі маладзёжнага конкурсу сацыяльнай антыкарупцыйнай рэкламы «Разам супраць карупцыі!». Ён праводзіўся сярод працаўнікоў магістралі ва ўзросце да 35 гадоў. Свае ідэі яны маглі аформіць у выглядзе плаката і (або) відэароліка. Усяго на разгляд журы было прадстаўлена восем відэаролікаў і 39 плакатаў, выкананых у розных мастацкіх тэхніках.**

У намінацыі «Найлепшы відэаролік» першае месца заняла работа электрамеханіка Гомельскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі Арцёма Базарава. На гэты конкурс чыгуначнік даслаў два відэаролікі, другі — створаны ў тандэме з мастацкім кіраўніком клубнай установы Культурна-спартыўнага комплексу Гомельскага аддзялення Валерыяй Бялецкай — заняў трэцяе месца ў гэтай жа намінацыі. Другое месца прысуджана рабоце машыніста крана аднаўленчага цягніка Брэсцкага аддзялення Дзмітрыя Чалідзэ.

Аўтарам найлепшага плаката на дадзеную тэму стала інжынер па арганізацыі і нарміраванні працы Цэнтра распрацоўкі нарматываў для арганізацыі і нарміравання працы Аліна Захарэўская. Сваю работу дзяўчына ствакрала на камп'ютары з дапамогай графічнага рэдактара.

Другое месца ў намінацыі «Найлепшы плакат» заваявала работа вядучага інжынера аддзела капітальнага будаўніцтва і праектавання Магілёўскага аддзялення Антона Шнейдарава. Замыкае прызавую тройку плакат метадыста клубнай установы Культурна-спартыўнага цэнтра Мінскага аддзялення Ксеніі Шашко.

Як адзначыў пры падвядзенні вынікаў конкурсу **старшыня журы намеснік начальніка Беларускай чыгункі Пётр СТОЦКІ**, пры разглядзе прадстаўленых работ улічвалася іх адпаведнасць заяўленай тэматыцы, глыбіня раскрыцця тэмы, крэатыўнасць, якасць выканання, патэнцыяльная магчымасць далейшага выкарыстання як сацыяльнай антыкарупцыйнай рэкламы, мастацка-эмацыйнае ўздзеянне свайго ўласнага стаўлення да абранай тэмы, інфарматыўнасць і г. д.

«На Беларускай чыгунцы вялікая ўвага ўдзяляецца прафілактыцы карупцыйных праяў. Гэта работа праводзіцца на сістэмнай аснове, — падкрэсліў Пётр Стоцкі. — Задача конкурсу — дадаткова прыцягнуць увагу моладзі да гэтай негатыўнай сацыяльнай з'явы, далучыць да дзейнасці па недапушчэнні карупцыйных праяў, да стварэння атмасферы нецярпімасці да падобных фактаў у працоўных калектывах. Дарога супраць карупцыі — гэтая ідэя прайшла лейтматывам праз усе прадстаўленыя работы.

Пераможцы і прызёры конкурсу будуць адзначаны грашовымі прэміямі, а іх работы накіруюць на Міжнародны маладзёжны конкурс сацыяльнай антыкарупцыйнай рэкламы «Разам супраць карупцыі!», арганізатарам якога з'яўляецца Генеральная пракуратура Расійскай Федэрацыі, а суарганізатарамі — аналагічныя ведамствы Беларусі, Арменіі, Кыргызстана, Агенцтва Рэспублікі Казахстан па справах дзяржаўнай службы і супрацьдзеянні карупцыі, Агенцтва па дзяржаўным фінансавым кантролі і барацьбе з карупцыяй Рэспублікі Таджыкістан.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**